**УДК 94 (476) "XVI–XVII"**

# САПЕГАЎСКІЯ ЎПЛЫВЫ Ў ПОЛАЦКІМ ВАЯВОДСТВЕ Ў КАНЦЫ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

***В.У. Галубовіч***
Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле прадпрымаецца спроба абагульнення інфармацыі пра ролю і месца палітычнай групоўкі магнацкага роду Сапег у Полацкім ваяводстве ў канцы XVI – першай палове XVII стагоддзя. Звернута ўвага на сінхроннасць маёмаснай і палітычнай экспансіі, пачатак якой паклала дзейнасць знакамітага Льва Сапегі. У першай палове XVII стагоддзя сапегаўская партыя здолела як замацавацца ў адміністрацыйным апараце ваяводства, так і здабыць сталых прыхільнікаў сярод мясцовай шляхты.*

Змаганне за ўладу, уласныя палітычныя, эканамічныя і культурна-рэлігійныя інтарэсы з'яўляецца неад'емнай часткай айчыннай мінуўшчыны і сучаснасці. Суб'ектамі гэтага змагання звычайна выступаюць як асобныя сацыяльныя групы, так і спецыяльна створаныя дзеля адстойвання сваіх інтарэсаў групоўкі, якія ў розныя часы выглядалі па-рознаму, але канструкт іх заставаўся аднолькавым па сваёй сутнасці і ўнутранай іерархіі. Падобнымі алігархічнымі пірамідамі былі пакрытыя беларуска-літоўскія землі на працягу ўсёй феадальнай эпохі. У межах апошняй асабліва вылучаецца перыяд знаходжання Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай, калі дамінантная сацыяльная група (шляхта) стала прывілееваным "палітычным народам", але з пэўнымі нюансамі. У сумарнай структуры насельніцтва агульная доля так званага пануючага класа максімальна сягала 10% [1, с. 3], з якіх паўнавартаснымі грамадзянскімі правамі карысталіся толькі мужчыны пэўнага ўзросту і статусу, што звужала да мінімуму колькасць гатовых і здольных да палітычнай актыўнасці грамадзян. Тут можна пакпіць з нешматлікасці тагачаснай грамадзянскай супольнасці, але ў які іншы перыяд нашай гісторыі нават такая доля насельніцтва ўдзельнічала ў рэальным палітычным жыцці, тым больш ва ўмовах легальнай канкурэнцыі? ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай захоўвала аўтаномію, у тым ліку палітычную, што выяўлялася ў наяўнасці не толькі асобных дзяржаўных інстытутаў (канвакацыі, з'езды станаў) [2; 3], але і ўласнага палітычнага тэатра са сваімі сталымі і новымі гульцамі [4; 5]. У працэсе дынамічнага грамадскага жыцця на тэрыторыі ВКЛ з канца XVI ст. выкрышталізаваліся два сталыя полюсы, адным з якіх з'яўляўся знакаміты Дом Сапег. Яго ўздзеянне было адчувальна на працягу некалькіх стагоддзяў па ўсім княстве, у тым ліку ў Полацкім ваяводстве, невялічкай ілюстрацыяй чаго можа быць ніжэй абагульненая інфармацыя.

***Падмуркі ўплыву***. У буйной гульні палітычная вага кожнай сілы звычайна карэлюецца не толькі з яе эканамічным патэнцыялам, але і з геаграфічным размеркаваннем і канцэнтрацыяй уласнасці. У гэтым сэнсе клан Сапег меў на Полаччыне фармальны дастатковы рэсурс для ўплыву, але яго рост быў паступовым.

Да Інфлянцкай вайны сапегаўскае землеўладанне на Полаччыне фактычна не фіксуецца, прынамсі, так выгдядае сітуацыя на 1552 г. [6, с. 54]. Тым не менш, прадстаўнікі сапегаўскага клана ў другой палове XVI ст. мелі на тэрыторыі Полацкага ваяводства свае спадчынныя ўладанні, як напрыклад Андрэй Сапега (памёр у 1611 г.) – спачатку староста аршанскі, а пазней віцебскі кашталян і мсціслаўскі ваявода [7, s. 574-575]. Як месца для грашовых інвестыцый Полацкае ваяводства стала набываць прывабнасць толькі пасля 1579 г., што засведчыла дзейнасць Льва Іванавіча Сапегі.

Знакаміты сваім матэрыяльным магнетызмам вялікі канцлер Л. Сапега стаўся ўласнікам уладанняў на Полаччыне (частка маёнтка Белая пад Лепелем) 29 кастрычніка 1591 г. [8, s. 100]. Пазней, у 1594 г., выкуплены у віленскай капітулы Лепель з Белай Сапега фундуе на ўтрыманне касцёла Св. Міхаіла Архангела ў Вільні [8, s. 102]. Дзякуючы шэрагу маніпуляцый, Леў Іванавіч з канца 1580-х гадоў прыдбаў, у тым ліку ад сваіх кодэньскіх сваякоў, значны комплекс зямель у Браслаўскім і Полацкім паветах. Між іншым у яго руках апынуліся Іказань, Друя, Чурылавічы, Дзедзін і Залессе [8, s. 100-101]. Бадай, найбуйнейшым набыткам у Полацкім ваяводстве стала купля Львом Сапегам Асвеі ў 1600 г. за 12 000 коп грошаў літоўскіх у віцебскага ваяводзіча Станіслава Кішкі [8, s. 101]. За такую ж суму Л. Сапега пазбавіўся на Полаччыне маёмасці Суша на карысць Пятра Стаброўскага, а ў 1630 г. набыў Бешанковічы ў Мікалая Хлявіцкага [8, s. 101]. Мелі ўладанні на Полаччыне і іншыя прадстаўнікі сапегаўскага клана. У 1607 г. справа пра спадчынную маёмасць Сапег (Мікалая, кухмістра ВКЛ, і Льва, гарадзенскага земскага суддзі) стала прадметам абмеркавання на сойме Рэчы Паспалітай, у выніку чаго была прынята асобная канстытуцыя аб адасланні спецыяльнай камісіі ў Полацкае ваяводства [9, s. 451].

Полацкая спадчына Л. Сапегі перайшла да яго сыноў, якія ад яе часткі даволі хутка пазбавіліся. Так, ужо 26 ліпеня 1633 г. Ян Станіслаў і Казімір Лявон Сапегі прадалі кароннаму стольніку Адаму Казаноўскаму маёмасць Чашнікі [10, с. 256-281]. Аднак большасць полацкіх уладанняў Л. Сапегі засталася ў руках яго сына Казіміра Лявона, які ў тастаменце 1655 г. згадваў як Асвею, так і Бешанковічы [11, s. 35]. У 1636-1646 гг. Бешанковічы Казімір Лявон аддаваў у заставу Паўлу Яну Сапезе, сувязі якога з Полаччынай рабіліся больш шчыльнымі [12, s. 146]. Так, ужо на пачатку 1637 г. Павел Ян праз шлюб з Соф'яй Зяновічоўнай атрымаў на Полаччыне маёмаць Воран [12, s. 146-147]. Потым, у 1646 г., шчодры, але бяздзетны Казімір Лявон, запісаў на свайго хроснага – Казіміра Яна Паўла, сына Паўла Яна, вялікі комплекс уладанняў у Браслаўскім і Полацкім паветах [13, s. 46]. Пасля смерці Казіміра Лявона ў 1656 г. Казімір Ян Павел Сапегаператвараецца ў полацкага землеўласніка. Адметна, што на момант складання падатковага рэестра ў 1667 г. сярод полацкіх абывацеляў ён дэклараваў выплату падаткаў з найбольшай колькасці дымоў "*з уласнасці сваёй на Задвінні, Асвеі, з дамамі жыдоўскімі і млынарскімі, з Іказані і Друі, з Сапежына*" [14, s. 73]. Акрамя таго, варта адзначыць, што Казімір Ян Павел Сапега ў 1667 г. засведчыў сябе як *полацкі абывацель*, акумулюючы ў падатковай дэкларацыі дадзеныя, якія датычыліся ўладанняў, размешчаных на тэрыторыі Браслаўшчыны. Відавочна, гэта было крокам да будучай заяўкі на пасаду полацкага ваяводы, якую ён займаў з 1670 г. па 1681 г. [15, s. 239].

Прыведзенага больш чым дастаткова, каб канстатаваць з'яўленне на мяжы XVI-XVII стст. сур'ёзнай матэрыяльнай базы для ўплываў Сапег на лакальнае шляхецкае грамадства. Аўтарам гэтага пераўтварэння стаў Леў Сапега, які паралельна запачаткаваў існаванне ў ВКЛ асобнай сапегаўскай групоўкі. Тым не менш, далёка не ўсё вызначаў матэрыяльны фактар.

***Сапегі і іх людзі***. Гістарыяграфічнай аксіёмай з’яўляецца сцвярджэнне, што аснову сваёй партыі складалі самі Сапегі, якія актыўна ўдзельнічалі ў разнастайных палітычных кампаніях [16, s. 505-508]. Гэта слушна ў адносінах тых рэгіёнаў ВКЛ, дзе былі размешчаны асноўныя маёнткі прадстаўнікоў роду. Полаччына да ліку такіх не адносілася. Гэта прадвызначыла тое, што Сапег полацкая шляхта не абірала ні соймавымі пасламі, ні дэпутатамі [17, с. 73-90; 18, s. 61-267]. Паказальна, што адзінымі мясцовымі ўрадамі, на якія спакушаліся прадстаўнікі гэтага магнацкага сямейства, былі вайтоўства і ваяводства [15, s. 292]. Гэтага было дастаткова, каб мець магчымасць уздзеяння на мясцовае грамадства і адміністрацыю. На мяжы XVI-XVII стст. такую персанальную ролю меў выканаць Андрэй Паўлавіч Сапега, полацкі ваявода ў 1597-1613 гг. [15, s. 237-238]. Прызначаны дзякуючы пратэкцыі Льва Сапегі, Андэй Паўлавіч вельмі хутка ахладзеў да сваіх абавязкаў і ўжо з 1600 г. пачаў шукаць магчымасць пазбавіцца ад клапатлівых абавязкаў, але справа зацягнулася. Маючы сталы ўзрост, праблемы са здароўем і перманентныя канфлікты з мясцовай публікай, Сапега толькі наездамі з’яўляўся ў Полацку. Не матывавалі яго нават каралеўскія наданні, у прыватнасці дадзеная Жыгомінтам Вазай у 1611 г. вёска Чарніцы [19, s. 572-573]. У выніку ажыццяўленне палітыкі Дома Сапег перакладалася на яго прыхільнікаў ці, прынамсі, на мясцовы апарат, падпарадкаваны ваяводзе.

Ваявода фармаваў персанальны склад гродскага суда, адпаведна суддзя і пісар не былі асобамі самастойнымі. У час ваяводства Андрэя Сапегі пісарамі гродскай канцылярыі былі *Ян Рагускі, Даніэль Шчыт Забельскі і Ян Сяліцкі* [15, s. 146-147]. У гэтым шэрагу варта звярнуць увагу на Д. Шчыта Забельскага. Гэты полацкі шляхціц, пачаткова праваслаўны, потым каталік, быў абавязаны ваяводзе і асабіста Льву Сапезе, з якім таксама шчыльна супрацоўнічаў, не толькі гродскім, але і земскім урадамі (з 1610 г. – земскі пісар) і фактычна з’яўляўся мясцовым агентам Сапег да сярэдзіны 1630-х гадоў: памёр на пасадзе полацкага падсудка ў 1635 г. [20, с. 77; 15, s. 168; 21]. Падобным чынам развівалася кар’ера Яна Сяліцкага, які з гродскага пісарства перайшоў у земскія ўраднікі і 24 жніўня 1612 г. стаў полацкім падстоліям, прычым ў намінацыйным прывілеі было адзначана, што за Сяліцкага прасіў не хто іншы, як сам канцлер Леў Сапега, які не мог не падтрымаць шляхціца, які ў час рокашу “*господару почт ставил*” [20, с. 79].

Не менш характэрная гісторыя мела месца і ў адносінах гродскіх суддзяў. Такіх вядома тры: *Андрэй Шавердзіч, Ян Рагоза і Міхал Стрэтавіч Тышкевіч* [15, s. 185]. Персаналіі гэтыя былі невыпадковыя. Так, падчас элекцыйнай кампаніі па абранні аршанскіх земскіх ураднікаў у верасні 1600 г. мясцовы староста А. Сапега прапаноўваў Льву Сапезе падтрымаць свайго кандытата – полацкага гродскага суддзю, а ў якасці асноўнага аргумента адзначаў, што Шавердзіч ***з маладосці з’яўляецца сапегаўскім слугой*** – ***“Дому нашаму служыць”*** [22, s. 251-252]. Іншая чалавечая інвестыцыя Андрэя Сапегі, у асобе Міхала Тышкевіча, добрага каталіка і сведкі цудаў Св. Язафата [23, s. 37-38], мела таксама доўгайгральны эфект: гэты сапегаўскі пратэжэ прайшоў з 1617 г. усе этапы службоўца земскага суда і памёр яго кіраўніком (у 1655 г. склаў тастамент, але наступнага суддзю манарх прызначыў толькі ў лістападзе 1658 г.) [20, с. 76-78; 15, s. 150, 168, 194].

У арбіце сваіх уплываў Леў Сапега трымаў і мясцовую спадчынную арыстакратыю, сярод якіх былі прадстаўнікі князёў Друцкіх Саколенскіх. Блізкія сваяцкія сувязі абумовілі прыналежнасць да сапегаўскай партыі Януша Саколенскага, дзякуючы чаму ён атрымаў у 1606 г. урад полацкага падкаморыя [24, s. 38-39]. Іншы прадстаўнік княжацкай сям’і, Крыштап Саколенскі, з 1625 г. полацкі кашталян, з маладосці знаходзіўся ў коле кліентаў і бліжэйшых супрацоўнікаў Сапегі, якому быў абавязаны сваімі кар’ернымі дасягненнямі [25, s. 42].

Асобы, звязаныя з Сапегамі ў полацкай земскай адміністрацыі, былі заўсёды, нават калі пазіцыі магнацкага клана былі не найлепшымі. Магчыма, рэхам ці вынікам заняпаду сапегаўскіх уплываў было толькі частковае запатрабаванне іх кандыдатаў на новыя земскія ўрады, уведзеныя Ўладзіславам Вазай у сярэдзіне 1630-х гадоў, але звяртае на сябе ўвагу тое, што пры гэтым апаненты Сапег нават не рызыкнулі кагосьці прапаноўваць ад сваёй партыі ў Полацкае ваяводства [26, s. 95-102]. Тым не менш, Уладзіслаў Корсак, кліент і асоба, дапушчаная да кіравання добрамі Казіміра Леона Сапегі [27, s. 298], прынамсі з 1636 г., карыстаўся тытулам полацкага мечніка [20, с. 80; 15, s. 126]. Узмацненне пазіцый Казіміра Лявона Сапегі ў другой палове панавання Ўладзіслава Вазы давала шанцы і яго прыхільнікам на Полаччыне. Пра гэта сведчыць намінацыя ў 1643 г. на ўрад стольніка Міхала Францкевіча Радзімінскага [20, с. 78; 15, s. 214]. Але сітуацыя была вельмі рухомай, і ўжо ў 1649 г. пасля смерці Радзімінскага полацкім стольнікам становіцца Тэадор Друцкі Горскі, прыхільнік біржанскіх Радзівілаў [28, s. 172].

Фактычна, Сапегі ў першай палове XVII ст. сфармавалі камплект прыбліжаных да сябе мясцовых кланаў, але аддавалі перавагу каталікам. Так, стала супрацоўнічалі з магнатамі прадстаўнікі каталіцкай галіны роду Францкевічаў Радзімінскіх [16, s. 509; 28, s. 52]. У арбіту абслугоўвання гаспадарчых інтарэсаў Сапег былі ўключаны таксама Шчыты і Корсакі [21; 27, s. 298].

***Павятовы соймік.*** У адрозненні ад уласна сапегаўскіх паветаў, напрыклад Слонімскага, дзе шляхецкае прадстаўніцтва стала кантралявалася Сапегамі, іх уплыў на полацкі соймік у канцы XVI ст. – першай палове XVII ст. аб’ектыўна меў месца, але не быў вызначальным. Гэта відаць, у першую чаргу, па камплектах паслоў ад полацкага сойміка, які рэгулярна галасаваў за сапежынцаў, напрыклад, за Д. Шчыта Забельскага [17, с. 73-76].

Тым не менш, вялікая колькасць пратэстанцкай шляхты, наяўнасць аўтарытэтных лідэраў (такіх, як Пётр Стаброўскі), спецыфіка структуры лакальнага землеўладання і асаблівасці гістарычнай свядомасці рабілі Полаччыну рэгіёнам, дзе складана было ўстанавіць дамінацыю, тым больш сямейству, якое выразна аддавала перавагу рымскаму папе. Фактычна ў часы Льва Сапегі яго мясцовая “партыя”, улучна з ваяводай, была партыяй рэгалістаў, арыентаваных на двор. Гэты выразна засведчылі ракашовыя падзеі 1606-1607 гг., у якіх клан Сапег выступіў на баку Жыгімонта Вазы, а полацкія сапежынцы зрабілі ўсё магчымае, каб абмежаваць радыкальна настроеных землякоў [17, с. 114-118]. Але павольныя змены часоў контррэфармацыі паступова карэктавалі рэлігійныя арыенціры і ўніфікавалі культуру палітычных паводзінаў мясцовай шляхты, што ў цэлым больш спрыяла Сапегам. Па слушнай заўвазе У. Аўгустыняк, менавіта на працягу першай паловы XVII ст., у часы абжывання Сапегамі Полаччыны, мясцовая шляхта, што відаць па яе прадстаўнічм інстытуце – павятовым сойміке, “эвалюцыянавала” ад радыкальнай апазіцыйнасці да адназначнай ультракаталіцкасці [29, s. 194].

***Высновы***. У Вялікім Княстве Літоўскім часоў існавання Рэчы Паспалітай альтэрнатыўным шляхецкім соймікам агрэгатам інтарэсаў былі магнацкія групоўкі, паміж якімі адбывалася асноўная палітычная канкурэнцыя. Выдатную ролю ў гэтым спаборніцтве адыгралі Сапегі, якія ўцягнулі ў сферу сваіх інатарэсаў полацкую шляхту. Запачаткаваны Львом Сапегам працэс маёмаснай “экспансіі” на Полаччыне адбываўся паралельна з пашырэннем сапежынскіх палітычных

уплываў. У канцы XVI ст. – на пачатку XVII ст. Сапегі гарантавалі сабе сталую прысутнасць у гродскай, а потым і ў земскай адміністрацыях, мелі ўплывы на полацкім сойміке і падтрымку сярод мясцовых шляхецкіх родаў, дзякуючы чаму сталі, побач з біржанскімі Радзівіламі, асноўнай палітычнай сілай у рэгіёне. Сумарныя багацці рода былі дастатковымі для ажыццяўлення на лакальнай сцэне, бадай, любых палітычных праектаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Лойка, П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI- першай трэці XVII ст. / Лойка П.А. – Мн.: БДУ, 2002. – 99 с.
2. Akta Zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. I: Okresy bezkrólewi (1572-1576, 1586-1587, 1632, 1648, 1696-1697, 1706-1709, 1733-1735, 1763-1764). – Warszawa: Wydawnictwo Neriton. Instytut Historii PAN; 2009. – 438 s.
3. Akta Zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. T. II. Okresy panowań królów elekcyjnych XVI-XVII wiek. – Warszawa: Wydawnictwo Neriton. Instytut Historii PAN; 2009. –452 s.
4. Rachuba, A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763 / A. Rachuba. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe; 2002. – 376 s.
5. Рахуба, А. Палітычныя групоўкі ў ВКЛ (1569-1732) / А. Рахуба // Спадчына. – 2002. – № 5-6. – С. 32-46.
6. Полоцкая ревизия 1552 года / Ред. И.И. Лаппо. – М.: Унив. Тип., 1905. – 237+XXII с.
7. Nagielski, M. Sapieha Andrzej / M. Nagielski // Polski słownik biograficzny. – T. XXXIV. – Wrocław–Warszawa–Kraków, 1992-1993. – S. 574-576.
8. Lulewicz, H. Sapieha Lew / H. Lulewicz // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa-Kraków, 1994. – S. 84-104.
9. Volumina legum. Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. – T. II. – Petersburg: Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki. –1859. – 482+ XIII s.
10. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов: в 39 т. – Вильна, 1865–1915. – Т. XXXIII: Акты относящиеся к истории западно-русской церкви. – Вильна: Типография «Русский почин», 1908. – 567+LXXXIV с.
11. Rachuba, A. Sapieha Kazimierz Leon / A. Rachuba // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa-Kraków, 1994. – S. 31-37.
12. Rachuba, A. Sapieha Paweł Jan / A. Rachuba // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa-Kraków, 1994. – S. 138-148.
13. Rachuba A. Sapieha Kazimierz Jan Paweł / A. Rachuba // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa-Kraków, 1994. – S. 37-48.
14. METRYKA LITEWSKA. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo połockie 1667 i 1690 r. Opracowali Henryk Lulewicz i Andrzej Rachuba. – Warszawa: Instytut Historii PAN, 2018. – 182 s.
15. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV-XVIII wieku : spisy. – T. V. Ziemia Połocka i województwo Połockie XIV-XVIII wiek. / pod red. Henryka Lulewicza. – Warszawa: IH PAN, 2018. – 306 s.
16. Rachuba, A. Fakcja Lwa Sapiehy – zarys problematyki / A. Rachuba // Między Lwowem a Wrocławiem. Ksiega jubileuszowa profesora Krystyna Matwijowskiego. – Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 2006. – S. 503-511.
17. Галубовіч, В. У. Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў.– Мінск: А.М. Янушкевіч, 2016. – 224 с.
18. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582-1696) : spis / pod red. Andrzeja Rachuby. Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2007. – 470 s.
19. Nagielski, M. Sapieha Andrzej / M. Nagielski // Polski słownik biograficzny. – T. XXXIV. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1992-1993. – S. 572-574.
20. Галубовіч В., Радаман А., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI- першая палова XVII стст.) / В. Галубовіч, А. Радаман, Д. Вілімас // Commentarii polocenses historici. – 2004. – Т. I. – С. 73– 80.
21. Rachuba, A. Szczytt (Szczyt, Szczit) Zabielski Daniel h. Radwan (ok. 1568-1635), podsędek połocki, poseł na sejmy // www.ipsb.nina.gov.pl.
22. Archiwum Domu Sapiehów wydane staraniem rodziny. – T. I. – Listy z lat 1575-1606. Opracował dr. A. Prochaska. – Lwów: Z drukarni zakładu narodowego im. Ossolińskich, 1892. –579+XXXV s.
23. Akta męczeńskie unii // Rocznik Towarzystwa historyczno-literackiego w Paryżu. – Rok 1868. – Paryż: Księgarnia Luxemburgska, 1869. – S. 1-63.
24. Lulewicz, H. Sokoliński Janusz / H. Lulewicz // Polski słownik biograficzny. – T. XL. –Warszawa-Kraków, 2000-2001. – S. 38-39.
25. Nagielski, M. Sokoliński Krzysztof / M. Nagielski // Polski słownik biograficzny. – T. XL. –Warszawa-Kraków, 2000-2001. – S. 42-43.
26. Rachuba, A. Kandydaci Piotra Kochlewskiego go nowych urzędów litewskich / A. Rachuba // Kwartalnik historychny. – 1991. – № 4. – S. 91-103.
27. Lulewicz, H. Elita polityczno-społeczna Wielkego Księstwa Litewskiego w połowie XVII wieku: Praca doktorska napisana w Instytucie Historycznym Uniwersytetu Warszawskiego / H. Lulewicz. – Warszawa, 1984. – 488 s.
28. Sawicki, M. Stronnictwo dworskie w Wielkim Księstwie Litewskim w latach 1648-1655 / M. Sawicki. – Opole, 2010. – 380 s.
29. Augustyniak, U. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej: Klientela wojskowa Krzysztofa Radziwiłła (1585-1640) / U. Augustyniak. – Warszawa: Wydawnictwo naukowe *Semper*, 2004 – 398 s.


## SAPIEHA'S INFLUENCES IN POLATSK PROVINCE AT THE END OF THE XVI-FIRST HALF OF THE XVII CENTURY

***V. Halubovich***

*The article attempts to generalize information about the role and place of the political grouping of the magnate Sapieha family in Polatsk province at the end of the XVI – first half of the XVII century. The attention is drawn to the process of synchronization of property and political expansion, which was initiated by the activities of famous Leo Sapieha. In the first half of the XVII century Sapieha party managed to gain a foothold in the administrative apparatus of the province and to find permanent supporters among the local nobility.*